Еўрарэгіён Белавежская Пушча

25 траўня 2002 года ў Хайнувцы было падпісана пагадненне аб стварэнні Еўрарэгіёна Белавежская Пушча паміж Рэччу Паспалітай Польшчай і Рэспублікай Беларусь. Еўрарэгіён ахоплівае ўнікальны комплекс Еўрапейскага і міравога маштаба першабытных лясоў Белавежскай Пушчы.

Еўрарэгіён Белавежская Пушча гэта міжнароднае таварыства адзінак тэрытарыяльнага самакіравання Польшчы і Беларусі.

Абшар супрацоўніцтва **з польскага боку** ахоплівае Хайноўскі Павят (Гміну і Горад Хайнувка, Гміну і Горад Клешчэле, Гміну Белавежа, Гміну Чэрэмха, Гміну Чыжэ, Гміну Дубіцэ Цэркевнэ, Гміну Нарэв, Гміну Нарэвка), а **з беларускага боку** - Камянецкі, Пружанскі і Свіслачскі Раён.

Мэтай супрацоўніцтва ў рамках **Еўрарэгіёну** з'яўляюцца сумесныя намаганні ў галінах:

- аховы натуральнага навакольля і рацыянальнага выкарыстання натуральных рэсурсаў,
- збліжэння народаў абедзьвух дзяржаў,
- захавання ўнікальнага прыроднага комплексу, якім з'яўляецца Белавежская Пушча, які мае ўплыў на клімат кантынэнту,
- павышэння ўзроўня жыцця жыхароў Еўрарэгіёну метадам здабыцця інвестыцый і рэалізавання трансгранічных гаспадарчых праграм,
- супрацоўніцтва і абмена грамадзкіх, навуковых, прафесійных, культурных і спартыўных груп, а таксама маладзёжных асяроддзяў,
- тварэння памосту паміж краінамі якія спрыяюць гаспадарчаму супрацоўніцтву,
- прасторнага добраўпарадкавання прыгранічных абшараў, у тым ліку разбудова трансгранічнай інфраструктуры,
- супрацоўніцтва ў галіне папярэджвання і ліквідацыі скуткаў стыхійных бедствій і станаў пагрозы,
- утварэння сучаснай, аднароднай сістэмы ўтылізацыі бытавых і прамысловых адходаў.

Адрас бюро еўрарэгіёна:

вул. Паркова 3

Хайнувка

тэл/факс: 00 48 85 682 51 41